УДК 303.446.2:316.733

# ТРОХМЕРНАЯ МАДЭЛЬ КУЛЬТУРНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ

***А. Д. Крывалап,*** *кандыдат культуралогіі, дацэнт кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Артыкул прысвечаны пытанням магчымасці выкарыстання траічнай канцэпцыі культурнай ідэнтычнасці ў сучасным свеце. Апорнай кропкай з'яўляецца траічная канцэпцыя разумення сацыяльна-культурнага вымярэння мовы і прасторы, якая была прапанавана А. Лефеўрам. У дачыненні да культурнай ідэнтычнасці выкарыстоўваюцца ідэі П. Гілберта і яго трыяда «інтэграцыя – канфлікт – каштоўнасці». Аўтар артыкула імкнецца ў першым набліжэнні акрэсліць магчымасці выкарыстання траічнай, а не дыхатамічнай мадэлі для разумення культурнай ідэнтычнасці.

**Ключавыя словы:** культурная ідэнтычнасць, траічная канцэпцыя культурнай ідэнтычнасці, сацыяльнае станаўленне.

# THREE-DIMENSIONAL MODEL OF CULTURAL IDENTITY

***A. Krivolap,*** *Candidate of Cuturological Sciences, Associate Professor of the Department of Culturology of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The text is devoted to consideration of the issues of the possibility of using the triple concept of cultural identity in the modern world. The reference point is the triadic concept of understanding the social and cultural dimension of language and space, which was proposed by H. Lefebvre. In relation to cultural identity, the author uses the ideas of P. Gilbert and his triad about integration – conflict – values. The author of the artickle seeks to first outline the possibilities of using triple rather than dichotomous models for understanding cultural identity.

**Keywords:** cultural identity, triple concept of cultural identity, social becoming.

Праблема ідэнтычнасці ўжо не першае дзясяцігоддзе застаецца актуальнай сярод даследчыкаў сацыяльна-культурнай сферы. Пры гэтым абсалютна натуральна, што падыходы да разумення магчымых шляхоў вырашэння і пошукаў ідэнтычнасці робяцца ўсё больш складанымі і шматузроўневымі.

У максімальна спрошчаным разуменні праблема ідэнтычнасці можа быць рэдукавана да пачуцця прыналежнасці – ідэнтычнасць як сінонім тоеснасці. Але гэта не прадугледжвае актыўнага суб’екта, які спрабуе сцвердзіць наяўнасць уласнай ідэнтычнасці. Магчымы прыклад – разнастайныя харчовыя дадаткі і араматызатыры, ідэнтычныя натуральным. Падобны ўзровень разумення культурнай ідэнтычнасці як прыналежнасці без актыўнага суб’екта была магчыма ў часы традыцыйнага грамадства даіндустрыяльнай эпохі. Але нават у тых складаных умовах была прапанавана двухузроўневая канцэпцыя ідэнтычнасці. Гэта тое, што значна пазней у псіхааналітычнай канцэпцыі культуры будзе сфармулявана як ідэнтычнасць асобы, якая грунтуецца не толька на падабенстве, але адначасова і на адрозненні. Неабходнасць выбіраць не толькі кім быць, з кім атаясамліваць сябе, але і адначасова не менш значная дакладнага разумення *Іншых* – тых, кім мы не з’яўляемся. Гэта тое, што больш шырока вядома як *Я – Іншы* ці *Мы – Яны*. Фактычна, пачынаючы з тэкста З. Фрэйда «Татэм і табу», ідэнтычнасць асобы разумеецца ў такім падвоенным ці двухмерным выглядзе. Гісторыя культуры мае шмат прыкладаў падобнага бінарнага стаўлення. Гэта спрадвечнае супрацьстаянне дабра і зла, непазбежны падзел на дзень і ноч, адзінства супрацьлегласцей інь–ян і інш. Сёння існуюць мовы, у якіх адсутнічае ніякі род, а ўвесь свет падзелены паміж жаночым і мужчынскім. Падобных прыкладаў бінарнасцей можна прывесці шмат. Але застаецца пытанне, наколькі паспяхова гэта мадэль акрэслівае і тлумачыць сацыяльную рэчаіснасць вакол нас і дазваляе зразумець сацыяльна-культурныя працэсы, сведкамі якіх мы з’яўляемся.

Жыццё мае значна больш колераў і іх адценняў, чым чыстыя фарбы, нават калі мы імкнемся ўспрымаць свет манахромна, як чорнае і белае. У гэтым сэнсе паказальна гісторыя фота і кіно з тэхналагічнага пункту гледжання, якія прашлі доўгі шлях эвалюцыі ад манахромнасці да паўнакаляровага спектру. Магчыма, што і мадэль бінарных апазіцый можа быць дапоўнена і ўскладнена дадатковымі элементамі. У свой час А. Лефеўр прапанаваў патроеную мадэль культуры, у якой прастора культуры дэтэрмінавана праз выкарыстанне мовы і якая прапануе працу на трох узроўнях: сімвалічным, сінтагматычным і парадыгматычным. Гэта той выпадак, калі «не дыхатамія, а траічнасць ці трохмернасць у разуменні свету дазваляюць больш глыбока інтэрпрэтаваць прастору як сацыяльны прадукт. Сацыяльная прастора можа адначасова мець наступныя адметнасці: гамагеннасць, фрагментацыя, іерархічнасць. Але

сацыяльная прастора не існуе без наяўнасці грамадства і праз яго практыку (успрыманне, асэнсаванне, перажыванне) робіцца даступным для індывідаў» [1, с. 114–115].

Якім чынам магчыма выкарыстоўваць ідэю А. Лефеўра аб патроеным характары культуры ў дачыненні да практык канструявання культурнай ідэнтычнасці? З аднаго боку, зразумелы абмежаванні дыхатаміі *Мы – Яны,* калі размова ідзе пра культурную ідэнтычнасць. Перш за ўсё таму, што магчымых *Іншых* значна больш, чым нашых уяўленняў аб нас саміх. І часам можа так здарыцца, што паміж нашымі ўяўленымі *Іншымі* будзе больш адрозненняў, чым паміж намі і імі. З іншага боку – гэта праблема размытасці і нявызначанасці ў пытаннях ідэнтычнасці, калі замест толькі адзінай магчымай нарматыўнай практыкі дапускаецца вар'ятыўнасць у выкарыстанні. Напрыклад, гэта магчыма заўважыць у такой моднай тэндэнцыі, як адзенне ўнісекс. Наяўнасць падобнага стылю робіць праблематычным выкарыстанне ранейшых бінарных мадэлей. Адпаведна паўстае пытанне аб пошуку тэарэтычнай мадэлі для тлумачэння тых працэсаў, якія адбываюцца сёння, бо ранейшыя тлумачэнні не валодаюць дастатковым эўрыстычным патэнцыялам.

У другой палове XX ст. культурныя даследванні прапанавалі ўласную патроеную рамку для інтэрпрэтацыі ўсяго, што адбываецца ў сацыяльнай сферы. І гэта рамка прадугледжвае выкарыстанне такіх элементаў, як раса, гендар і клас, калі абсалютна любая з'ява разглядаецца непасрэдна праз гэтыя тры элементы. У дачыненні да культурнай ідэнтычнасці гэта значыць тры ўзроўні, на якіх даследуюцца тыя ці іншыя з'явы.

Аднак магчыма не абмяжоўвацца выключна трыядай «раса – гендар – клас». Паводле П. Гілберта, магчыма па-іншаму паглядзець на гэту праблему і выкарыстоўваць трыяду «інтэграцыя – канфлікт – каштоўнасці».

***Інтэграцыя*** – гэта тое, што дазваляе нам разумець культурную ідэнтычнасць як аб'ядноўваючы фактар. Культура – гэта тое, што нас аб'яўдноўвае. «Культура як сіла, якая кіруе індывідуальнымі паводзінамі, сама павінна выконваць гэту інтэграцыйную функцыю» [2, p. 36]. Падобнае разуменне адпавядае функцыянальнаму разуменню культуры. Калі цэласнасць і ўстоўліваць супольнасці грунтуецца на ўнутраным кансэнсусе ў дачыненні да практык і традыцый, а не залежаць ад знешніх чыннікаў.

***Канфлікт.*** Кожная культурная адметнасць і непаўторнасць мае канфліктны патэнцыял у дачыненні да іншых. Такое разуменне культурнай ідэнтычнасці дазваляе казаць не толькі аб тым, што мы належым да пэўнай групы, але і сведчыць аб тым, што мы адрозніваемся ад іншых, і нашы стастункі з імі могуць быць патэнцыйна канфліктнымі. Асабліва гэта тычыцца канструктывісцкіх падыходаў да разумення

культурнай ідэнтычнасці, калі культурныя адметнасці ствараюцца не на ўзроўні функцыянавання ўсёй культуры, а як адметнасці штодзённага жыцця асобы, як індывідуальныя практыкі. У такім выпадку культурная ідэнтычнасць стварае магчымыя канфліктныя сітуацыі і правакуе абвастрэнне старых канфліктаў.

***Каштоўнасці*** – разуменне культуры як сукупнасці норм і правіл, якія правяраюцца на штодзённым узроўні праз практыку. «Ні ў якім выпадку культурная ідэнтычнасць не залежыць ад прыналежнасці да культурнай групы ў звыклым цяпер этнаграфічным разуменні грамадства, сістэматычна адмежаванага ад іншых сваёй агульнай культурай» [Там жа, p. 45]. Немагчыма атрымаць культурную ідэнтычнасць па факту нараджэння. Культурная ідэнтычнасць – гэта вынік індывідуальных намаганняў суб’екта ў працэсе сацыяльнага станаўлення.

Такім чынам, прастора культуры можа быць асэнсавана праз разуменне трохузроўневай мадэлі канструявання культурнай ідэнтычнасці. Культурная ідэнтычнасць дэтэрмінава абранымі часовымі рамкамі і не мае ўніверсальнага характару. Сацыяльна-культурны кантэкст, у якім адбываецца канструяванне культурнай ідэнтычнасці, прадугледжвае наяўнасць адпаведнай культурнай формы і прынцыпаў арганізацыі. Патроены характар культурнай ідэнтычнасці сведчыць аб магчымасцях утварэння супольнасці, правакавання канфліктаў і пошуку кансэнсуса ў разуменні каштоўнасцей. Стварэнне культурнай ідэнтычнасці непазбежна выклікае неабходнасць выпрацоўкі адказаў на аксіялагічныя пытанні адносна разумення мінулага і ўяўлення праекта будучыні.

1. *Крывалап, А. Д.* Траічная канцэпцыя А. Лефеўра: ад мовы да прасторы / А. Д. Крывалап // Национальные культуры в межкультурной коммуникации : материалы VII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 7–8 апр. 2022 г. / Белорус. гос. ун-т ; редкол.: Т. Д. Рабец (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2023. – С. 112–115.

2. *Gilbert, P.* Peoples, Cultures and Nations in Political Philosophy / P. Gilbert. – Edinburgh : Edinburgh University Press, 2000. – 232 p.